# Лепшыя моўныя кабінеты

**58 матэрыялаў аб рабоце 33 кабінетаў беларускай мовы і літаратуры і 25 кабінетаў рускай мовы і літаратуры з усіх раёнаў вобласці былі прадстаўлены на конкурс, які з ліпеня па снежань мінулага года праводзіла галоўнае ўпраўленне адукацыі Гродзенскага аблвыканкама.**

Як паведамілі ў Гродзенскім абласным інстытуце развіцця адукацыі, ацэньваліся адукацыйны і метадычны ўзровень кабінетаў, пошук новых ідэй і інавацыйных падыходаў да стварэння арганізацыйна-метадычнага, дыдактычнага, матэрыяльна-тэхнічнага суправаджэння, педагагічнага ўзаемадзеяння на базе прадметных кабінетаў.

Па выніках конкурсу дыпломы I ступені атрымалі кабінеты беларускай мовы і літаратуры і рускай мовы і літаратуры сярэдняй школы № 1 Ліды. Таксама лепшыя кабінеты рускай мовы і літаратуры працуюць у сярэдняй школе № 38 Гродна і гімназіі № 1 Астраўца, лепшыя кабінеты беларускай мовы і літаратуры — у сярэдняй школе № 3 Ашмян, сярэдняй школе № 8 Слоніма, сярэдняй школе № 5 Ваўкавыска і сярэдняй школе г.п. Краснасельскі Ваўкавыскага раёна.

**Надзея ВАШКЕЛЕВІЧ.**
*grodna@nastgaz.by*